## X сесія Вярхоўнага Совета СССР 1-га склікання

### У Совеце Нацыянальнасцей

# Спрэчкі па дакладу аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1944 год

## Прамова дэпутата І. С. БЫЛІНСКАГА

Таварышы дэпутаты! Прадстаўлены Советам Народных Камісараў Саюза ССР на разгляд X сесіі Вярхоўнага Совета СССР Дзяржаўны бюджэт на 1944 год ярка адлюстроўвае перамогі совецкага народа і тыя велізарныя задачы, якія стаяць перад намі ў справе канчатковага разгрому і выгнання фашысцкіх захопнікаў з нашай свяшчэннай зямлі, у аднаўленні народнай гаспадаркі, разбуранай нямецкімі варварамі, у вызваленых ад нямецкай акупацыі раёнах, у справе далейшага развіцця народнай гаспадаркі і культуры народаў Совецкага Саюза.

Мінулы 1943 год азнаменаваны вялікімі поспехамі і перамогамі совецкага народа і яго доблеснай Чырвонай Арміі на франтах Айчыннай вайны і далейшым умацаваннем Совецкай дзяржавы пад кіраўніцтвам вялікай комуністычнай партыі большэвікоў і генія чалавецтва таварыша Сталіна.

Абмеркаванне сесіяй Дзяржаўнага бюджэта праходзіць у дні, калі авеяная славай гераічная Чырвоная Армія, кіруемая Вярхоўным Галоўнакамандуючым Маршалам Совецкага Саюза вялікім Сталіным, громіць і гоніць нямецка-фашысцкія орды на захад, узламвае доўгачасовыя абарончыя збудаванні праціўніка, ламае жорсткае супраціўленне ворага і крок за крокам ачышчае совецкую зямлю ад фашысцкіх акупантаў.

Згуртаванасць і гераізм нашага народа, бліскучыя подвігі Чырвонай Арміі ў Вялікай Айчыннай вайне пераканаўча паказалі несакрушальную сілу совецкага ладу, непахіснае адзінства народаў Совецкага Саюза. **«Дружба народаў нашай краіны,**—гаворыць таварыш Сталін, — вытрымала ўсе цяжкасці і выпрабаванні вайны і яшчэ больш загартавалася ў агульнай барацьбе ўсіх совецкіх людзей супроць фашысцкіх захопнікаў».

Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка, якая святкавала ў гэтым годзе сваё 25-годдзе, у брацкім саюзе народаў СССР, з дапамогаю вялікага рускага народа, пры паўсядзённай увазе і клопатах таварыша Сталіна за годы совецкай улады перамагла векавую адсталасць і ператварылася ў краіну з развітай прамысловасцю і перадавой калгаснай сельскай гаспадаркай. За годы сталінскіх пяцігодак у рэспубліцы былі пабудаваны сотні новых фабрык і заводаў, занава створаны станкабудаўнічая, металаапрацоўчая, машынабудаўнічая і хімічная галіны прамысловасці. Бесперапынна расла пасеўная плошча Беларусі, расла ўраджайнасць соцыялістычных палёў. Калгасны лад забяспечыў сялянам Беларусі заможнае і культурнае жыццё. Небывалага росквіту дасягнулі культура, навука і мастацтва Беларусі. Няўхільна рос матэрыяльны дабрабыт працоўных, радасным і шчаслівым жыццём жыў беларускі народ.

У жыцці нашага народа адбылася выдатная падзея—з'яднанне ўсіх беларускіх земляў у адзінай беларускай дзяржаве.

Вераломны напад нямецка-фашысцкіх разбойнікаў на Совецкі Саюз у чэрвені 1941 г. спыніў мірную творчую працу беларускага народа. Па-зладзейску напаўшы на нашу зямлю, нямецкія разбойнікі прынеслі з сабой страшэнныя разбурэнні, знішчылі сотні тысяч мірных жыхароў, знішчылі матэрыяльныя і культурныя каштоўнасці, знішчылі ўсё тое, што было створана і заваявана ўпорнай працай народа за годы совецкай улады.

Грудамі руін, папялішчамі, шыбеніцамі пакрылі нямецкія звяры беларускую зямлю. Фашысцкімі бандытамі ператвораны ў руіны старэйшыя гарады Беларусі—Мінск, Гомель, Віцебск, Магілёў, Бабруйск, Гродна, Баранавічы і іншыя. Спалены і абрабаваны школы, бібліятэкі, клубы і іншыя культурныя і навуковыя ўстановы рэспублікі. Разбураны і знішчаны тысячы вёсак. Цяжкае гора перажывае беларускі народ, які яшчэ знаходзіцца пад гнётам акупантаў. Фашысцкія разбойнікі нанеслі беларускаму народу жорсткія і пакутлівыя раны. Яны расстрэльваюць, вешаюць, спальваюць жывымі, атручваюць у «душагубках» тысячы нявінных старых, жанчын і дзяцей, гоняць дзесяткі тысяч совецкіх людзей на нямецкую катаргу ў Германію.

У сваіх страшэнных замыслах супроць народаў Совецкага Саюза, іх культуры, свабоды і нацыянальнай незалежнасці нямецка-фашысцкія бандыты паставілі задачу знішчыць беларускую дзяржаўнасць, заняволіць наш народ, ператварыць яго ў рабоў нямецкіх паноў. Але вораг пралічыўся: як-бы ні быў жорсткі і пакутлівы фашысцкі гнёт, пад якія-б пакуты ні пападаў беларускі народ, зламаць яго сілу, яго волю да супраціўлення нямецкім варварам не ўдалося і ніколі не ўдасца.

Свабодалюбівы беларускі народ, ахоплены невымяральнай смяротнай нянавісцю да нямецкіх варвараў, па загаду таварыша Сталіна з першых дзён вайны са зброяй у руках узняўся на барацьбу з адвечным ворагам—нямецкімі захопнікамі. Вось ужо больш двух год беларусы мужна змагаюцца з ворагам, адстойваючы чэсць, свабоду і незалежнасць соцыялістычнай Радзімы.

На франтах Айчыннай вайны разам з рускім, украінскім і другімі брацкімі народамі геранчна змагаюцца сыны беларускага народа. Іх баявая доблесць адзначана высокімі ўзнагародамі: за час Айчыннай вайны многа генералаў і афіцэраў, тысячы чырвонаармейцаў-беларусаў, узнагароджаны за свае подвігі ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза.

У тыле ворага, на беларускай зямлі, з небывалай сілай разгарэлася ўсенародная партызанская барацьба. Сотні тысяч гітлераўскіх разбойнікаў знайшлі сабе пагібель ад помстнай рукі народных мсціўцаў—беларускіх партызан і партызанак. Доблесныя партызаны і партызанкі громяць тылы праціўніка, наносяць удары па камунікацыях нямецкай арміі, усімі сіламі дапамагаюць Чырвонай Арміі разбіць нямецкіх захопнікаў.

Беларускі народ крывёю сваіх сыноў яшчэ больш умацаваў саюз брацкай дружбы з вялікім рускім народам і другімі народамі Совецкага Саюза, яшчэ мацней згуртаваўся вакол сваёй роднай большэвіцкай партыі і любімага правадыра таварыша Сталіна.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі